*С.А.ПАЎЛАВА*

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАФЕСІІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯЕ РАЗВІЦЦЯ

Бібліятэкі на працягу ўсёй гісторыі свайго існавання арыентаваны на выкананне сацыяльных функцый. Таму іх дзейнасць падпарадкавана аптымальнаму інфармацыйнаму забеспячэнню жыццядзейнасці грамадства ўвогуле і кожнага карыстальніка асобна. Бібліятэкар як істотны элемент любой бібліятэкі, у тым ліку і электроннай, будзе існаваць у яе сістэме да таго часу, пакуль грамадству будзе неабходна сама бібліятэка. Гэта тлумачыцца тым, што шмат інтэлектуальных аперацый, якія здзяйсняюцца ім, у большасці выпадкаў пакуль не могуць быць выкананы машынай, якой бы дасканалай яна ні была.

Вывучэнне прафесіі бібліятэкара прайшло некалькі этапаў [1]. Пры яе вывучэнні на сучасным этапе мы павінны абапірацца на тыя дасягненні, якія былі зроблены ў папярэднія часы. Першы і самы інтэнсіўны перыяд у гэтым напрамку – 20-я гады XX ст. У той час савецкі бібліятэкар разам з іншымі палітасветніцкімі работнікамі стаў прадметам сумесных даследаванняў бібліятэказнаўцаў, псіхолагаў, медыкаў, якія выкарыстоўвалі псіхалагічныя методыкі. Разгарнулася праца метадычнага і практычнага характару, заснаваная на апісанні і дакладным аналізе розных прафесій, ствараліся псіхафізічныя класіфікацыі прафесіі. У канцы 20-х гадоў, ва ўмовах, калі метадычныя і тэарэтычныя асновы савецкай псіхалагічнай навукі яшчэ не аформіліся, псіхатэхнікам упершыню ўдалося падысці да вывучэння прафесіянальнай дзейнасці з улікам разнастайных знешніх фактараў, спецыфічных для канкрэтных відаў працы. Прынцыпы, метады і прыёмы псіхалагічнага вывучэння прафесіянальнай дзейнасці склалі прафесіяграфію, сутнасць якой зводзілася да распрацоўкі апісальна-тэхнічнай і псіхафізіялагічнай характарыстык. У выніку прафесіяграфавання складаліся прафесіяграмы, свайго роду партрэты прафесій.

Вывучэнне абапіралася на трактоўку бібліятэчнай прафесіі як прапагандысцкай і культурна-асветніцкай дзейнасці, як часткі ідэалагічнай работы ўвогуле. Асаблівая ўвага на гэтым этапе надавалася праблеме сацыялагічнай устаноўкі, аналізаваліся характэрныя рысы працы і быту бібліятэкараў, абмяркоўваліся задачы і шляхі падрыхтоўкі кадраў.

У эксперыментальных даследаваннях 20-х гадоў, якія праводзіліся разам з псіхолагамі, фізіёлагамі, гігіеністамі, пры вывучэнні бібліятэчнай працы выкарыстоўваўся багаты арсенал метадаў, у тым ліку метад уключанага назірання, пробы на ўвагу, хуткасць, рэакцыю, стамляльнасць. У канцы 20-х гадоў, як паказвае аналіз публікацый, паспяхова распачатыя распрацоўкі спыняюцца. Грамадства перажывае такія формы развіцця, якія не прадугледжваюць апору на навуку. Замацоўваецца вера ва універсальную эфектыўнасць адміністрацыйна-камандных метадаў. Агульная сітуацыя не магла не адбіцца на вывучэнні бібліятэчнай прафесіі.

Некаторы час бібліятэчная справа развівалася ў сістэме Наркамасветы. Эксперыментальныя распрацоўкі і атрыманыя вынікі дазваляюць лічыць 20-я гады этапам стварэння бібліятэчнай прафесіялогіі, хаця яна і не вылучалася тады ў цэласны комплекс і вывучалася галоўным чынам у рэчышчы праблематыкі навуковай арганізацыі працы і часткова бібліятэчнай псіхалогіі.

Пры аналізе даследаванняў 20-х гадоў у галіне распрацоўкі бібліятэчнай прафесіялогіі не заўсёды называюцца працы М.А.Рубакіна, заслугай якога з'яўляецца праблемнае вывучэнне ролі суб'ектаў кніжнай і бібліятэчнай дзейнасці, разнастайнасці формаў адлюстравання ў ёй асобаснага фактара. М.А.Рубакін сканцэнтраваў увагу на дзейнасці спецыяліста як важнага фактара функцыянавання кніжнай і бібліятэчнай справы і лічыў першасным элементам кніжнай дзейнасці работніка і яго працу. Усю дзейнасць ён звёў да чатырох фактараў: 1) агент (аўтар, аратар, бібліёграф, бібліятэкар і іншыя суб'екты кніжнай справы); 2) перцыпіент (чытач, слухач); 3) лінгвістычны знак (слова, тэкст, кніга, літаратура); 4) асяроддзе (умовы, месца і час). Гэтыя фактары знаходзяцца ў функцыянальнай залежнасці паміж сабой [6].

Да М.А.Рубакіна пытанне аб суб'екце бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, функцыянальных, змястоўных, арганізацыйных, сацыяльна-псіхалагічных і іншых асаблівасцях яго працы спецыяльна не разглядалася. М.А.Рубакін разумеў, што суб'ект бібліятэчнай справы павінен выконваць вызначаныя абавязкі, адлюстроўваць інтарэсы пэўнай сацыяльнай групы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павінен быць уключаны ў грамадскі працэс, уплываць на яго даступнымі сродкамі, садзейнічаць прагрэсіўнай перабудове грамадства шляхам фарміравання грамадскага мыслення. Усе кампаненты ў структуры суб’екта Рубакіным пра- аналізаваны.

Бібліятэкары ў працэсе сваёй дзейнасці, адзначаў М.А.Рубакін, уступаюць у адносіны двух тыпаў: бібліятэкар–кніга і бібліятэкар–чытач. Адносіны “бібліятэкар–чытач” з’яўляюцца больш складанымі. У сваіх працах М.А.Рубакін лічыў, што пробным каменем кожнай кнігі ёсць і будзе асоба чалавека, гэта праходзіць чырвонай ніткай праз усю бібліялагічную тэорыю, якую ён распрацаваў.

Спецыфіка працоўнай дзейнасці бібліятэкара, яго ўключанасць у розныя працэсы, сферы адносін (суб’ект–аб’ектныя, суб’ект–суб’ектныя) знаходзяць адлюстраванне ў сістэме патрабаванняў, якія прад’яўляюцца да прафесіянальных якасцей, псіхалагічных прымет асобы, сукупнасці ведаў, уменняў, навыкаў. Распрацоўка вучоным псіхолага-педагагічных праблем кніжнай і бібліятэчнай справы, стварэнне ім бібліяпсіхалагічнай тэорыі далі магчымасць паставіць комплекс агульнанавуковых ведаў у прафесійным блоку бібліятэкара на адно з галоўных месцаў. Набыццё ведаў па агульнай, сацыяльнай і індывідуальнай псіхалогіі, выкарыстанне іх у тэорыі і практыцы бібліятэчнай работы – неабходныя элементы прафесіяналізму. У працах М.А.Рубакіна сфармуляваны погляды на суб’ект бібліятэчнай дзейнасці, вызначаны мэты, змест і патрабаванні да прафесіі бібліятэкара.

Другі этап у вывучэнні бібліятэчнай прафесіі звязаны з адраджэннем навуковага статусу сацыялогіі і псіхалогіі, умацаваннем тэарэтычных асноў бібліятэказнаўства як грамадскай навукі, правядзеннем сацыялагічных даследаванняў. Аб неабходнасці навуковага падыходу да прафесіянальнай дзейнасці было заяўлена на першай канферэнцыі па навуковай арганізацыі працы, якая адбылася ў 1971 г., дзе была прапанавана канкрэтная даследчая тэматыка па гэтай праблеме [10]. Сярод тэарэтычных распрацовак найбольшай абгрунтаванасцю характарызуецца канцэпцыя А.В.Сакалова, які абагульніў вынікі аўтаматызацыі і механізацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, у іх уключаны не толькі вытворчыя, але і асобасныя фактары эфектыўнасці працы [7]. Гэты этап ахоплівае пачатак 70 – сярэдзіну 80-х гадоў. Яго можна вызначыць як перыяд распрацоўкі сучаснай метадалогіі, актыўнага назапашвання даследчых вынікаў, фарміравання спецыяльнай тэрміналогіі.

Аналізуючы этапы станаўлення і развіцця бібліятэчнай прафесіі, неабходна падкрэсліць ролю Ю.М.Сталярова ў фундаменталізацыі праблематыкі, яго канцэптуальную чатырохэлементную мадэль бібліятэкі, якая ўключае “персанал” (бібліятэкара) [9].

Трэці этап вывучэння прафесіі бібліятэкара распачаўся комплексным буйнамаштабным сацыялагічным даследаваннем “Библиотечная профессия вчера, сегодня, завтра”, якое ўзначаліў Ленінградскі дзяржаўны інстытут культуры. Па сутнасці ўпершыню прафесія вывучалася шматаспектна. Комплексная навуковая тэма ўключала распрацоўку асноўных кірункаў кадравых рэсурсаў бібліятэчнай справы (вылучаліся бібліятэчныя, бібліяграфічныя кадры і прафесарска-выкладчыцкі склад спецыяльных вучэбных устаноў, а таксама студэнты і навучэнцы; бібліятэказнаўцы, бібліятэкары-даследчыкі закліка్ны творча развіваць бібліятэчную справу). Узгодненая дзейнасць пералічаных груп неабходна для жыццядзейнасці бібліятэчнай сістэмы як сацыяльнага інстытута, што ўключае практыку, адукацыю і навуку. Асноўныя тэарэтычныя вынікі даследавання прааналізаваны А.В.Сакаловым і А.С.Чачко [8]. У даследаванні прымалі ўдзел бібліятэкі, вышэйшыя навучальныя ўстановы, у тым ліку і кафедра бібліятэказнаўства Мінскага інстытута культуры. Задачы даследавання поўнасцю не былі рэалізаваны ў сувязі са змяненнямі сацыякультурнай сітуацыі ў пачатку 90-х гадоў ХХ ст.

На падставе названых і іншых публікацый, аналізу тэхналогіі абслугоўвання, уліку перспектыў развіцця бібліятэчнай справы намі быў зроблены прафесіяграфічны аналіз бібліятэкара як суб'екта абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. У выніку была прадстаўлена прафесіяграма бібліятэкара аддзела абслугоўвання (веды, уменні, навыкі, прафесіянальна значныя асобасныя якасці) [4]. Вылучаны тры ўзроўні ў сістэме ведаў: агульнанавуковыя, агульнапрафесійныя і спецыяльныя прафесійныя. Агульнанавуковыя і агульнапрафесійныя веды неабходны кожнаму спецыялісту, занятаму абслугоўваннем карыстальнікаў, незалежна ад тыпу, віду бібліятэкі і падраздзялення, у якім ён працуе. Агульнанавуковыя веды забяспечваюць шырокі кругагляд спецыяліста і яго гуманістычную накіраванасць: у галіне філасофіі, сацыялогіі, гісторыі, этыкі, эстэтыкі, тэорыі культуры, сацыялагічнай псіхалогіі, педагогікі, інфарматыкі, мастацкай літаратуры. Гэтыя веды арыентуюць спецыяліста ў дакументных камунікацыях, іх тыпах, відах, ДБА. Агульнапрафесійныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

веды ўключаюць веданне тэорыі абслугоўвання (паняцце аб сістэме бібліятэчнага абслугоўвання – значэнне, функцыі, мэты, суб'екты, аб'екты, тэхналогіі, методыкі, вынікі абслугоўвання), методык па вывучэнні чытацкіх патрэб і ўзроўню культуры чытання, чытацкіх меркаванняў аб бібліятэцы. Агульнанавуковыя і агульнапрафесійныя веды акумулююцца ва ўменнях і навыках спецыялістаў.

У прафесіяграме спецыяліста адзначаюцца прафесійна значныя асобасныя якасці: інтэлектуальная культура, якая ў першую чаргу характарызуецца гнастычнымі якасцямі (здольнасці аналізаваць, абагульняць, пераключаць увагу, хуткасць рэакцыі і інш.); камунікатыўнасць (уменне слухаць, уменне данесці да слухача свае думкі); эмпатыя.

Бібліятэкару, занятаму абслугоўваннем, побач з агульнанавуковымі і агульнапрафесійнымі, неабходна валодаць і спецыяльнымі прафесійнымі ведамі і ўменнямі. Гэта звязана з тэндэнцыяй структурнай спецыялізацыі абслугоўвання па відах і формах паслуг.

Сёння створаны спецыяльныя падраздзяленні МБА, выставачнай работы, кансалцінгавыя службы. Абслугоўванне якасна зменіцца, калі яго будуць здзяйсняць работнікі, якія глыбока ведаюць разам з агульнай тэорыяй бібліятэчнага абслугоўвання кансультацыйны, выставачны, міжбібліятэчны, даведачны і іншыя віды абслугоўвання.

Адзначаецца спецыфіка ў патрабаваннях да бібліятэкараў, занятых абслугоўваннем карыстальнікаў у бібліятэках розных тыпаў і відаў. Яна выклікана асаблівасцямі запытаў карыстальнікаў, зместам і формай прадстаўляемых па- слуг. Гэтыя пытанні дэталёва разглядаюцца ў манаграфіі М.Я.Дворкінай [3], дзе прапанавана новая канцэпцыя бібліятэчнага абслугоўвання. Даследаванне праведзена з пазіцый сістэмна-дзейнаснага падыходу. Прапанавана мадэль спецыяліста аддзела абслугоўвання ў кантэксце сучасных праблем.

Характэрная асаблівасць сённяшняга дня – бібліятэкар павінен пастаянна вучыцца, каб паспяваць за зменамі, якія адбываюцца ў грамадстве. Бібліятэкары адчуваюць патрэбу не толькі ў вышэйшай адукацыі, але і ў павышэнні кваліфікацыі, у набыцці сумежных прафесій. На змяненне бібліятэчнай прафесіі ўплывае сацыяльная арыентацыя публічных бібліятэк, якая абумовіла з'яўленне ў канцы XX ст. кірунку "дэфекталагічнага бібліятэказнаўства". Ён узнік на падставе высвятлення і вывучэння спецыфікі бібліятэчнага абслугоўвання асоб з фізічнымі і разумовымі недахопамі, уяўляе сінтэз карэкцыйна-педагагічных і бібліятэказнаўчых ведаў. Гэта абумоўлівае з'яўленне ў бібліятэках такіх спецыяльнасцей, як бібліятэкар-псіхолаг (рыхтуе Санкт-Пецярбургскі універсітэт культуры), бібліятэкар-педагог (падрыхтоўка вядзецца ў Маскоўскім універсітэце культуры і мастацтваў). У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, улічваючы патэнцыял кафедраў менед- жменту інфармацыйна-дакументнай сферы, сацыякультурнай дзейнасці і педагогікі, мэтазгодна арганізаваць падрыхтоўку бібліятэкара-сацыяльнага педагога, дзе ўвага надавалася б праблемам псіхалогіі ўспрымання тэксту, бібліятэрапіі, pablic relations, арганізацыі правядзення вольнага часу, дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў і інш. Таксама цікавая кваліфікацыя бібліятэкара-дызайнера, паколькі гэтаму пытанню ў бібліятэках сёння надаецца шмат увагі.

Сацыяльнай ролі бібліятэкараў у інфармацыйным грамадстве прысвячаецца шэраг публікацый расійскіх навукоўцаў [5]. Для бібліятэчнай дзейнасці сёння характэрныя тэхнізацыя, тэхналагізацыя. Інфарматызацыя сама па сабе не з'яўляецца супермэтай грамадства, яна павінна разглядацца як спосаб яго інтэлектуалізацыі, пашырэння культурна-інфармацыйных магчымасцей кожнага.

Вынікі даследаванняў уключаюцца ў вучэбныя дапаможнікі, праграмы пэўных дысцыплін. Існуе шмат падыходаў да зместу і метадаў навучання будучых бібліятэкараў у межах дысцыпліны "Бібліятэчная прафесіялогія", якая чытаецца ў вядучых вышэйшых навучальных установах. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры прапанаваны новы курс "Бібліятэчная прафесіялогія: праблемы і перспектывы". Ён неабходны для спецыяльнай падрыхтоўкі і пашырэння гарызонтаў бібліятэчнай прафесіі. Прафесія бібліятэкара ў Беларусі ў навукова-даследчай дзейнасці буйных бібліятэк (НББ, Прэзідэнцкая бібліятэка) фрагментарна вывучалася на ўзроўні навукова-метадычных распрацовак. Аднак асэнсаванне гэтай праблемы магчыма толькі пры фундаментальным даследаванні, якое дазволіць вырашыць метадалагічныя праблемы бібліятэчнай прафесіялогіі, вывучыць сістэмны аб'ект, які мае складаную структуру: прафесіянальныя групы (работнікі бібліятэк усіх тыпаў і відаў); сацыяльныя групы (выкладчыкі і студэнты ВНУ і група бібліятэказнаўцаў), якія творча развіваюць бібліятэчную справу. Неабходна асэнсаванне гістарычнага аспекту бібліятэчнай прафесіі, што забяспечыць паглыблены аналіз яе праблематыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Библиотечная* профессиология: проблемы становления и развития: Сб. науч. тр. – СПб.: Изд-во Санкт-Петербург. ун-та, 1992. – 286 с.

2. *Дворкина М.Я.* Библиотечное обслуживание: новая реальность: Лекция. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та культуры и искусств, 2001. – 48 с.

3. *Дворкина М.Я.* Библиотечное обслуживание: теоретический аспект. – М.: Изд-во МГИК, 1993. – 248 с.

4. *Павлова С.А.* Профессиография библиотекаря отдела обслуживания: Текст лекции. – Мн.: Бел. ин-т культуры, 1991. – 24 с.

5. *Российское* библиотековедение: XX век. Направления развития, проблемы и итоги: опыт монографического исследования / Рос. гос. б-ка; Сост. и предисл. Ю.П.Мелентьевой; Науч.ред. Л.М.Инькова. – М.: ФАИР-ПРЕСС, Пашков дом, 2003. – 432 с.

6. *Рубакин Н.А.* Избранное: В 2 т. – М.: Книга, 1975. – Т.1. – 224 с.; Т.2. – 260 с.

7. *Соколов А.В.* Автоматизация библиографического поиска. – М.: Книга, 1981. – 107 с.

8. *Соколов А.В., Чачко А.С.* Методологические проблемы библиотечной профессиологии // Библиотечная профессиология: проблемы становления и развития: Сб.науч.тр. – СПб.: Изд-во Санкт-Петербург. ун-та, 1992. – С. 3 –17.

9. *Столяров Ю.Н.* Библиотека: структурно-функциональный подход. – М.: Книга, 1981. – 235 с.

10. *Тематика* исследовательской и методической работы по НОТ в библиотеках // Научная организация труда в библиотеках: Материалы науч. и практ. конф. (сентябрь, 1971) – М.: Моск. гос. ин-т культуры, 1972. – С. 114 –119.

11. *Чачко А.С.* Библиотечный специалист: особенности труда и профессионализации. – Киев: Наукова думка, 1986. – 192 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ